# СВЯТА ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ І ТУРЫСТАЎ

## У Гродне пошта і СМІ аб'ядналіся на фестывальнай пляцоўцы

**Сваю друкаваную прадукцыю прадставілі рэспубліканскія і мясцовыя выданні, сярод якіх — Выдавецкі дом «Звязда», медыяхолдынг «СБ. Беларусь сегодня», «Гродзенская праўда», «Перспектива». Кожны наведвальнік мог не толькі азнаёміцца са свежымі і архіўнымі нумарамі газет, але і аформіць падпіску. Ніхто не застаўся без падарунка.**

Напрыклад, у павільёне выдавецкага дома «Звязда» кожны падпісчык мог атрымаць у дадатак кубак альбо майку з лагатыпам, магніт, блакнот і аўтаручку. Адзін са стэндаў адлюстроўваў шырокі спектр выдавецкай дзейнасці. Вока вабіла дзіцячая літаратура — байкі, вершы, апавяданні ў маляўнічых пераплётах.

Гараджане і госці горада з ахвотай прымалі свежыя газетныя нумары ад прадстаўнікоў рэдакцый і работнікаў абласнога філіяла «Белпошты». Не засталіся ўбаку ад беларускіх выданняў і турысты. Ёнас і яго жонка Бірута з літоўскага горада Пасваліс захапілі з сабой у дарогу нумар «Звязды». Заўважылі, што яшчэ не забылі беларускую мову, бо вучыліся ў Мінску. Зараз наведваюць Гродна без візаў, і такіх аўтобусаў з польскімі і літоўскімі нумарамі толькі на Савецкай плошчы было каля дзясятка. Некаторыя замежныя турысты скарысталіся паслугамі экспрэс-пошты і адправілі сваім родным і знаёмым паштоўкі з відамі старога Гродна.

Каб задаволіць наведвальнікаў і паказаць магчымасці пошты, на плошчы развярнулася імправізаванае паштовае аддзяленне. Ветлівыя прадстаўнікі абласнога філіяла «Белпошты» прымалі камунальныя плацяжы, афармлялі пасылкі, выдавалі наяўныя грошы. Турысты набывалі калекцыйныя выданні, сувеніры з сімволікай Гродна, паштоўкі, а гараджане карысталіся паслугамі, а таксама афармлялі падпіску.

— Наш філіял выпусціў серыю падарункавых сертыфікатаў на розныя выданні, як для дзяцей, так і для дарослых. І зараз падпіску можна падараваць сваім родным ці сябрам, — паведаміла




**намеснік дырэктара Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Святлана МЯКІШ.**

Многія наведвальнікі падтрымалі ініцыятыву пошты і выпісалі выданні на адрас дзіцячых дамоў. Інтарэс да перыядычнай дзіцячай літаратуры расце, бо многія бацькі такім чынам знаходзяць альтэрнатыву камп'ютару. Тым больш што рынак дзіцячых выданняў вельмі шырокі.

Фестываль пошты і СМІ накіраваны на тое, каб прадэманстраваць магчымасці паштовых паслуг і друку. Цяпер засталося вырашыць некаторыя арганізацыйныя пытанні, напрыклад, дадаць фестывалю яскравасці і музычнага суправаджэння.

— Вядома, гэта пробны каменьчык, які падрыхтавалі галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама і Гродзенская філіяла РУП «Белпошта», — зазначыла Святлана Мякіш. — Сродкі масавай інфармацыі ідэю падтрымалі — напоўнілі зместам выдзеленыя ім павільёны. Месца тут зручнае — цэнтр горада, заўсёды многа турыстаў. Думаю, свята ў такім фармаце трэба ладзіць некалькі разоў на год, асабліва ў перыяд падпісных кампаній.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Усплёск спёкі, навальніцы, магчымы град

**На гэтым тыдні нас чакае высокая тэмпература паветра, навальніцы, шквалістыя ветры, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду, 28 чэрвеня, пераважна без ападкаў, толькі днём па захадзе і ў асобных раёнах кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература ноччу 5—12 цяпла, днём 22—29 вышэй за нуль, у паўднёва-заходніх раёнах да плюс 31 градуса.

Далей з паўднёвага захаду Еўропы будуць рухацца актыўныя атмасферныя франты, услед за якімі будзе перамяшчацца вельмі цёплая, але няўстойлівая паветраная маса.

У чацвер, 29 чэрвеня, ноччу па паўночным захадзе, днём у асобных раёнах, пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны будуць ісці кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Днём чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду, месцамі магчымы град. Тэмпература ноччу 13—20 градусаў цяпла, па паўночным усходзе 10—12 са знакам плюс, днём сіноптыкі прагназуюць 28—34 вышэй за нуль, у асобных раёнах па поўдні да плюс 36 градусаў.

У пятніцу, 30 чэрвеня, на большай частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы, узмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду, днём магчымы град. Тэмпература ноччу 16—23 цяпла, днём чакаецца плюс 25—32, па паўднёвым усходзе магчыма да 34 градусаў вышэй за нуль.

У першы дзень ліпеня ноччу пераважна па паўднёвым усходзе, днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Пры апошніх у асобных раёнах узмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду. Тэмпература ноччу 13—20 градусаў цяпла, днём чакаецца плюс 20—27, па паўднёвым усходзе — да 30 градусаў вышэй за нуль.

У нядзелю, 2 ліпеня, на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах краіны навальніцы. Тэмпература ноччу 10—17 градусаў цяпла, днём 17—24 вышэй за нуль, па паўднёвым усходзе чакаецца да плюс 27 градусаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Маем гонар

# А НА ПЛЯЧАХ — ПАГОНЫ ЛЕЙТЭНАНТА

**Нягледзячы на пахмурнае дажджлівае надвор'е, на Плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску ў суботу панаваў святочны настрой.**
**Яно і не дзіўна — 199 выпускнікоў Інстытута пагранічнай службы Беларусі ўрачыста развіталіся са сваёй альма-матар.**



Рытуал уручэння пагонаў, дыпломаў і нагрудных знакаў, прынясенне Кодэкса гонару афіцэра органаў пагранічнай службы, развітанне з Баявым Сцягам і памежны вальс сталі складнікамі ўрачыстай цырымоніі.

— У вас скончыліся напружаныя гады вучобы, — зазначыў **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта генерал-маёр Анатоль ЛАПО.** — Глыбока сімвалічна, што выпуск афіцэраў-пагранічнікаў адбываецца ў чэрвені. Бо зусім нядаўна споўнілася 76 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай. Гэта абавязвае вас быць годнымі памяці герояў, працягваць традыцыі папярэдніх пакаленняў. Сёння перад намі Прэзідэнтам і ўрадам пастаўлены важныя задачы, якія датычацца пагранічнай бяспекі Беларусі. І для пагранічніка няма большага гонару, чым самааддана служыць сваёй краіне.

У пагранічніка ёсць сапраўдны прывілей, які накладвае на яго дадатковыя абавязкі. Гэта права хадзіць па першых метрах нашай зямлі і ахоўваць яе ад няпрошаных гасцей.

— Магу з упэўненасцю заявіць — сёлетнія выпускнікі з гонарам выканаюць доўг па абароне мяжы, — кажа **начальнік Інстытута пагранічнай службы Васіль ГЕДЗЬКО.** — Вырашаць гэтыя задачы будуць прафесійна падрыхтаваныя, дысцыплінаваныя і гатовыя да цяжкасцяў афіцэры.

**Лейтэнант Леанід Ровін** будзе несці службу ў Лідскім пагранічным атрадзе.

— Я ведаю, што ўсіх нас чакае складаны шлях. Прафесія пагранічніка вельмі няпростая. Акрамя тэарэтычных ведаў, трэба валодаць вялікай колькасцю навыкаў і ўмець іх спалучаць, — кажа ён. — Але падчас праходжання службовай практыкі на памежных пастах я атрымаў каласальны вопыт.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# Летняя ночка купальная

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта ў гэтыя дні сонца дасягае свайго апагея і паварочвае на восень. У адпаведнасці з земляробчым календаром славян — нашых продкаў, — ракаўцы ўжо не першы год наладжваюць купальскі абход паселішча, заклікаючы жыхароў на свята. Само святочнае дзейства адбываецца на старажытным гарадзішчы каля ракі Іслач. Дзяўчаты і хлопцы, упрыгожаныя вянкамі з палявых кветак, апранутыя ў народныя строі, водзяць карагоды вакол вогнішча і спяваюць аўтэнтычныя абрадавыя песні, услаўляючы росквіт прыроды і аддаючы пашану нашым далёкім продкам. Гэтым разам гаспадаром купальскай ночы быў вядомы гурт «Гасцінец» — захавальнік і папулярызатар песеннай і абрадавай спадчыны, да яго далучыліся маладзёжныя фальклорныя гурты са сталіцы і школьнікі з вёскі Путчына Дзяржынскага раёна, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усю ноч гучалі мелодыі і найгрышы на народных інструментах у выкананні самабытных музыкаў.





**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



■ На слыху

# У ДТЗ ТРАПІЎ... ТАНК

**У суботу па дарозе на генеральную рэпетыцыю ваеннага парада, які 3 ліпеня адбудзецца ў Мінску, танк Т-72 урэзаўся ў дрэва і знёс ліхтарны слуп у раёне станцыі метро «Маскоўская». На шчасце, ніхто не пацярпеў.**

Як расказаў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Уладзімір МАКАРАЎ,** тэхнічная праверка паказала, што баявая машына была спраўная. «Здарэнне ў многім абумоўлена складанымі ўмовамі надвор'я: амаль увесь дзень ліў дождж — асфальт быў мокры, — растлумачыў прадстаўнік Міністэрства абароны. — Расследаванне працягваецца. Для выключэння падобнага ў будучыні прыняты дадатковы комплекс мер».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*